Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Дварэцкая сярэдняя школа”

# Інфармацыйная гадзіна
# “Навіны палітыкі і эканомікі”

## (інфармацыя +)

Падрыхтавала
класны кіраўнік IX класа
Жых Марына Вячаславаўна
18.11.2019 г.

2019

Дата правядзення: 18.11.2019 г.

Клас: 9

Класны кіраўнік: Жых Марына Вячаславаўна

Месца правядзення: кабінет рускай мовы

Час правядзення: 8.30-9.15 гадзін

Тэма: Навіны палітыкі і эканомікі

Форма правядзення: інфармацыя +

Формы і метады: метад “Свежы погляд”,

Мэта: стварыць умовы для арыентавання у сучасных падзеях палітыкі, культуры, эканомікі, спорту ў Рэспубліцы Беларусь і ў свеце ў цэлым.

Задачы:

- матываваць вучняў да пошуку аб’ектыўнай інфармацыі,
- удасканальваць уменне арыентавацца ў падзеях палітыкі і эканомікі розных гадоў,
- развіваць лагічнае мысленне, развіваць уяўленне аб своеасаблівасці гістарычных перыядаў.

Абсталяванне: артыкулы газет “Перамога”, “Советская Белоруссия” за мінулы тыдзень і ранейшыя гады (2015, 2016 гг) у электронным варыянце.

План правядзення

I.Арганізацыйны этап.

Прывітанне.

Арганізацыя рабочых месцаў.

II. Мэтавызначэнне.

1. Тэма інфармацыйнай гадзіны.

2. Сумесная пастаноўка задач інфармацыйнай гадзіны.

III. Работа з газетнымі артыкуламі.

1. Арганізацыя работы груп.

- Сягодня мы будзем працаваць у групах. Першая група будзе працаваць з газетнымі артыкуламі на палітычныя тэмы, другая – з навінамі эканомікі. Вам неабходна прачытаць артыкулы. Будзьце уважлівымі. Артыкулы не маюць назвы, таму вам неабходна выбраць тыя, якія адпавядаюць вашай тэме.

Наступны этап вашай работы – адабраць артыкулы, якія не адпавядаюць часу. Абгрунтуйце свой выбар. Затым аб'яднайце сучасныя артыкулы адной назвай (напрыклад, "Беларускі варыянт развіцця").

2. Работа груп з газетнымі артыкуламі.

3. Прэзентацыя работы групы.

- Тэзісна перадаюць змест сучасных артыкулаў.

- Называюцца выбраныя артыкулы 2015, 2016 гадоў. Даюцца тлумачэнні, чаму артыкулы не з'яўляюцца актуальнымі.

IV. Падвядзенне вынікаў